
Падтрымай "Вясну" на PATREON

Мінск: за выдаленыя праз дзесяць хвілін паведамленні — тры гады калоніі

13.04.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, грамадства, ціск

У судзе Першамайскага раёну Мінска вынеслі прысуд індывідуальнаму прадпрымальніку, цырульніку з Брэсту 31-гадовага Андрэю Сачанку па артыкулах `364` і `366` Крымінальнага кодэксу. Яго асудзілі да трох гадоў пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму.

Суд таксама абавязаў Сачанку выплаціць **маральную шкоду** ў **дзве тысячы рублеў** пацярпеламу Кавальчуку, **дзяржпошліну — 87 рублеў і працэсуальныя выдаткі — 12 капеек.**

Справу разглядзеў суддзя **А. Кулік**. Дзяржабвінавачанне падтрымала **Лапёнак**.

У чым прызналі вінаватым?

Андрэя Сачанку прызналі вінаватым у тым, што ў жніўні і верасні ў сацыяльнай сетцы Вконтакте ён напісаў паведамленні з пагрозамі гвалту дваім супрацоўнікам АМАП **Віктару Краўчуку** і **Руслану Кавальчуку**, бацькам ваеннага **Дзяніса Патрушава** і выкладчыку МДЛУ **Ігару Пучэні**. У выніку гэтага ён "*парушыў псіхалагічны і душэўны спакой*" пацярпелых.

Па словах дзяржабвінавачання, віна Сачанкі пацвярджаецца словамі абвінавачанага, пацярпелых, сведак, матрэярыяламі справы: скрыншотамі паведамленняў, якія дасылаў Сачанка, каментарыі абвінавачанага ў сацыяльных сетках.



Мінск: прадпрымальніка з Брэста судзяць за выдаленыя ім праз 10 хвілін паведамленні

Справу разглядае суддзя А. Кулік

Андрэй Сачанка поўнасцю прызнаў віну па абодвух артыкулах, з СІЗА дасылаў пацярпелым лісты з прабачэннямі.

Што казалі ў спрэчках?

Дзяржабвінаваўца **Лапёнак** была ўпэўненая, што віна даказаная, паколькі абвінавачаны прызнаў яе, пацвердзіў свае дзеянні. Яна падкрэсліла, што паведамленні былі накіраваныя, каб перашкодзіць законнай дзейнасці супрацоўнікаў міліцыі, а пагрозы былі ўспрыняты імі як рэальныя. Чыстасардэчнае прызнанне пракурор прасіла залічыць як змякчальныя абставіны. Яна папрасіла прызнаць яго вінаватым і прызначыць тры гады пазбаўлення волі паводле 364 артыкула і два гады — паводле артыкула 366. У сукупнасці — асудзіць Сачанку да **трох гадоў пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму**. Менавіта такое пакаранне прызначыла суддзя.

Адвакат папрасіла ўлічыць чыстасардэчнае прызнанне, прызнанне віны і супрацоўніцтва са следствам. У звязку з гэтым кваліфікацыя злачынства не выклікала ў яе сумневаў. Пытанне, на якое яна папрасіла звярнуць увагу, — мера пакарання. Паколькі злачынствы, учыненыя яе падабаронным, можна кваліфікаваць як "менш цяжкія", яны не прынеслі шкоды жыццю і здароўю людзей, судом павінна быць спагнана справядлівая грашовая кампенсацыя. Яна таксама адзначыла станоўчыя характарыстыкі Сачанкі ягонымі сваякамі. Яна папрасіла прызначыць мужчыне пакаранне ў выглядзе абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову — "хатнюю хімію".

Твитнуть









Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды згубілі сваю функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла знішчальную атаку". Павел Сапелка — на канферэнцыі АБСЕ

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць









ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY